Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

7 мая 2014 года, № 7 (2110)





*У гэтыя майскія дні мы разам з усім беларускім народам, іншымі народамі свету адзначаем вялікую гістарычную дату –* ***69-ю гадавіну Вялікай Перамогі над фашызмам.***

# З Днём Вялікай Перамогі!

Вайна з гітлераўскай Германіяй і яе саюзнікамі стала для савецкага народа Вялікай Айчыннай вайной, якая па сваіх маштабах і жорсткасці не мела сабе роўных у гісторыі.

**Суровая цана вайны.** Паводле ранейшых афіцыйных звестак, вайна забрала жыцці 2,2 млн беларусаў. Сённяшнія гісторыкі ўжо нават кажуць пра 3 млн чалавек (г. зн. загінуў кожны трэці даваенны жыхар). Было знішчана 209 гарадоў і гарадскіх пасёлкаў, 9200 вёсак (пры гэтым 627 вёсак напаткаў трагічны лёс Хатыні). Амаль кожная сям'я ў Беларусі страціла роднага альбо блізкага.

**Урокі на будучыню.** Вайна адышла ў мінулае, але людзі памятаюць пра яе, імкнуцца асэнсаваць яе ўрокі. Яны хочуць ведаць, чаму чалавецтва апынулася ў такой кровапралітнай бойні і як не дапусціць паўтарэння падобнага. Сённяшняму пакаленню цяжка сабе нават уявіць, якім бы быў свет у выніку рэалізацыі планаў гітлерызму, якія каласальныя высілкі спатрэбіліся, каб спыніць, а потым разграміць агрэсараў.

Вялікая Айчынная вайна была барацьбой розуму з цемрашальствам, дабра са злом. Тысячы студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў БДУ ўдзельнічалі ў гэтай барацьбе, мужна і самаахвярна змагаліся на франтах, у партызанскіх атрадах, падпольных арганізацыях, у глыбокім савецкім тыле, а таксама ў шэрагах еўрапейскага Супраціўлення і саюзных армій. Многія з іх не вярнуліся з вайны. Наш боль пра загінулых ніколі не заціхне. Але без іх подзвігаў не было б Перамогі.

**Памяць неўмiручая.** Светлая памяць пра герояў вайны ўвекавечана народам у мемарыялах, помніках, абелісках, у кнігах (у тым ліку ў Кнізе памяці БДУ). Мы схіляем галовы перад мужнасцю загінулых герояў, а таксама аддаём даніну глыбокай павагі нашым ветэранам. Усцешна, што дагэтуль працягваюць педагагічную дзейнасць *Драбязка Сцяпан Рыгоравіч,* прафесар кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права; *Дулаў Андрэй Васільевіч,* прафесар кафедры крыміналістыкі; *Котаў Альберт Іосіфавіч,* дацэнт кафедры новай і найноўшай гісторыі; *Сачанка Іван Іванавіч,* прафесар кафедры замежнай журналістыкі і літаратуры; *Умрэйка Дзмітрый Сцяпанавіч,* прафесар, галоўны навуковы супрацоўнік лабараторыі нелінейнай оптыкі і спектраскапіі, *Чыгір Васіль Фёдаравіч,* прафесар кафедры грамадзянскага права; *Юркевіч Мікалай Рыгоравіч,* прафесар кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права.

Усяго ў пярвічнай ветэранскай арганізацыі БДУ зараз знаходзіцца на ўліку 36 чалавек. Іх багаты жыццёвы вопыт і пасільная праца ва ўніверсітэце садзейнічаюць грамадзянска-патрыятычнаму і маральна-этычнаму выхаванню студэнцкай моладзі.

*З нагоды 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў я жадаю ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, усім супрацоўнікам універсітэта шчасця, аптымізму, здароўя і здзяйснення гуманных мэтаў нашай альма-матар.*

***Са святам Перамогі!***

**Рэктар БДУ акадэмік**
**С. У. АБЛАМЕЙКА**

# Хроніка ваеннага часу Белдзяржуніверсітэта

## 1941 год

**21 чэрвеня.** Завяршаецца падрыхтоўка да святкавання 20-й гадавіны Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Разгарнулася выстава навуковых прац.

*За 20 гадоў універсітэт падрыхтаваў 5240 спецыялістаў.*

Напярэдадні вайны ў БДУ дзейнічала 6 факультэтаў і 33 кафедры. Педагагічную і навуковую працу вялі 17 прафесараў, 41 дацэнт, 42 старшыя выкладчыкі, 28 выкладчыкаў, 23 асістэнты. З іх 60 чалавек – выпускнікі БДУ.

У аспірантуры навучаліся 60 чалавек. Яе скончылі 98 чалавек. З 1937 па 1941 гг. 39 выпускнікоў БДУ абаранілі кандыдацкія дысертацыі.

**22 чэрвеня.** Пачалася Вялікая Айчынная вайна. У першыя дні вайны 450 студэнтаў і выкладчыкаў БДУ з'явіліся ў прызыўныя пункты.

**28 чэрвеня.** Нямецка-фашысцкія захопнікі акупавалі Мінск.

**Чэрвень.** Супрацоўнікі ўніверсітэта А. В. Вязовіч, Я. М. Зубковіч, З. Завістовіч, А. К. Ціток і інш. пры дапамозе праф. М. А. Прыляжаева перавезлі частку кніг бібліятэкі, экспанатаў заалагічнага музея, архіва ў дом па вуліцы Віцебскай для захавання на перыяд вайны.

## 1943 год

**Студзень.** СНК БССР звярнуўся ў СНК СССР з хадайніцтвам наконт аднаўлення дзейнасці БДУ для развіцця нацыянальнай культуры і навукі.

**16 лютага.** У Маскву быў выкліканы П. П. Савіцкі, які працаваў дырэктарам Ніжнетагільскага педінстытута і быў адноўлены на пасадзе рэктара БДУ.

**15 мая.** Саўнаркам СССР прыняў пастанову «Пра аднаўленне працы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».

**11 кастрычніка.** БДУ распачаў працу *на ст. Сходня Кастрычніцкай чыгункі.* Галоўны вучэбны корпус размясціўся ў будынку школы, а выкладчыкі і студэнты – у 40 дачных доміках. Частка студэнтаў займалася ў будынку Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Да вучобы на гістарычным, філалагічным, біялагічным, геаграфічным, фізіка-матэматычным, хімічным факультэтах прыступілі 289 студэнтаў. Заняткі вялі 40 выкладчыкаў.

**25–26 снежня.** У Маскве ў зале Маскоўскай кансерваторыі адбылося ўрачыстае пасяджэнне навукова савета БДУ, прысвечанае 25-годдзю БССР.




Фота Аляксандра СНАПКА

## 1944 год

**Студзень.** Прафесарска-выкладчыцкі склад універсітэта налічвае 4 акадэмікі, 18 прафесараў і 24 дацэнты, а ўсяго 65 чалавек.

У зімовую сесію 15 % студэнтаў БДУ здалі іспыты толькі на «выдатна», 21 % – на «выдатна» і «добра». Нездавальняльныя адзнакі па асобных прадметах атрымалі 39 % студэнтаў.

**3 ліпеня.** Войскі 1-га і 3-га Беларускіх франтоў вызвалілі сталіцу Савецкай Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

**Канец ліпеня.** У Мінск са ст. Сходня вярнулася першая група студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта колькасцю 75 чалавек для падрыхтоўкі будынкаў да заняткаў.

**15 жніўня.** Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР званне Героя СССР прысвоена выпускніку ўніверсітэта В. А. Парахневічу.

**1 верасня.** Створаны факультэт журналістыкі.

**Кастрычнік.** Пачаліся рэгулярныя заняткі на 7 факультэтах. У 1945/46 навуч. г. з 895 студэнтаў 121 быў дэмабілізаваны з шэрагаў Чырвонай Арміі, 76 з'яўляліся ўдзельнікамі партызанскага руху. Праз год ва ўніверсітэце навучалася болей за 300 былых франтавікоў і партызан.

Пачала працаваць універсітэцкая бібліятэка. ВНУ Масквы, Ленінграда і іншых гарадоў падарылі бібліятэцы БДУ каля 25 тыс. кніг.

Званне заслужанага дзеяча навукі БССР прысвоена Ц. М. Годневу, М. Е. Макушку, К. М. Міцкевічу (Якубу Коласу), У. М. Перцаву.

## 1945 год

**24 сакавіка.** Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР званне Героя Савецкага Саюза прысвоена выпускніку ўніверсітэта М. П. Катлаўцу (пасмяротна).

**9 мая.** Дзень перамогі над фашысцкай Германіяй.

**19–23 мая.** Адбылася навуковая сесія БДУ, прысвечаная аднаўленню працы ўніверсітэта ў Мінску і ўдзелу яго супрацоўнікаў і студэнтаў у аднаўленні народнай гаспадаркі БССР.

**Снежань.** Пачаўся першы паваенны навучальны год у аспірантуры БДУ.

Даваенная навучальна-навуковая і вытворчая база ўніверсітэта была ў асноўным адноўлена толькі ў канцы 1950 г. У той час ва ўніверсітэце на 35 кафедрах працавалі 170 выкладчыкаў (з іх 14 прафесараў і 60 дацэнтаў), на 6 факультэтах навучалася болей за 1700 студэнтаў.

# «ТАКІ МАЛАКАСОС, А ЎЖО КАМАНДЗІР РОТЫ. ЧАМУ?»

«Адзін абстраляны салдат у баі варты 10 неабстраляных», – так можна сказаць пра **Георгія ДАВІДЗЮКА,** вядомага навукоўца-сацыёлага, доктара філасофскіх навук. Падчас Вялікай Айчыннай вайны яму так і не давялося пабыць салдатам. Яго адразу прызначылі камандзірам аддзялення партызанскага атрада, затым – камандзірам узвода, і ў няпоўныя 20 гадоў – камандзірам роты.



Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

Георгій Пятровіч успамінае, як былы капітан Чырвонай Арміі, з якім разам ішлі выконваць заданне партызанскага кіраўніцтва, абураўся: «Ты такі малакасос, а ўжо камандзір роты. Чаму?» «Запытай пра гэта ў начальніка штаба», – коратка адказаў яму тады Георгій Давідзюк.

Пра такіх ветэранаў, як Георгій Давідзюк, гавораць яшчэ, што ён «пораху панюхаў». «Што праўда, то праўда», – згаджаецца прафесар. Порах ён нюхаў кожны тыдзень, а можа і некалькі разоў на тыдзень, і добра ведае, чым той пахне. «Аднойчы так панюхаў, што ледзь не страціў жыццё», – жартуе Георгій Пятровіч.

Партызаны яго роты вельмі часта выходзілі на падрыў чыгуначных рэек, якія фашысты выкарыстоўвалі для сваіх патрэб. Міну закладвалі пад рэйкі, а падрывалі іх пры дапамозе шнура, які цягнуўся далёка ў лес. Не паспеў Георгій Давідзюк адысці ад замініраваных рэек на бяспечную адлегласць, як прагучаў выбух. Яго засыпала зямлёй, а асколкі ад міны моцна ўпіліся ў спіну. Пасля гэтага выпадку камандзірам партызан было забаронена самім падрываць чыгуначнае палатно. Для гэтага з Масквы спецыяльна былі прысланы вывучаныя мінёры.

Трэба сказаць, што Георгій Давідзюк быў паранены ў баях некалькі разоў, амаль кожны год на працягу вайны. Першае раненне ў правае плячо ён атрымаў у 1942 г. у адкрытым баі з немцамі пад Ганцавічамі. Другое яго напаткала пад Кобрынам зімой 1943 г., калі ён праваліўся пад лёд і пакалечыў ногі, уцякаючы ад нямецкіх патрулёў. Трэцяе раненне здарылася падчас абароны Дняпроўска-Бугскага канала ад мадзьярскага палка, які немцы кінулі супраць беларускіх партызан.

Бой з мадзьярамі адбыўся на ўчастку Ляхавічы–Зарэчка 21 лютага 1944 г. Рота Давідзюка ў складзе брыгады атрада імя Шыша смела ўступіла ў сутычку з ворагам. Заняўшы паўночную частку ўсё таго ж Дняпроўска-Бугскага канала, праціўнік атакаваў роту і спрабаваў прарвацца праз мост, фарсіраваць у розных месцах водную перашкоду. Партызаны рашуча дзейнічалі ў гэтых абставінах. Калі ў трэцюю атаку выйшлі да драўлянага моста тры танкі, Георгій Давідзюк загадаў некалькім партызанам падрыхтаваць супрацьтанкавыя гранаты.

У апошні момант дапамог мінамёт: міна трапіла ў гусеніцу танка. З люка пачалі вылазіць ворагі. У гэты час запрацаваў партызанскі кулямёт. Танкісты мёртвымі павіслі на бране танка. Двухкіламетровы ўчастак канала адной роце з групай разведчыкаў утрымаць было складана, бо яны змагаліся з цэлым батальёнам мадзьяраў. Здавалася, што рота Давідзюка і ўзвод разведкі вычарпалі свае магчымасці, заканчваліся боепрыпасы. Вёска Зарэчка палала ў агні. З-за вугла дома Давідзюк адкрыў агонь з аўтамата. Падчас стральбы разрыўная куля ворага трапіла ў далонь, аўтамат выпаў з рук. Георгій перавязаў руку і працягнуў бой.

Нягледзячы на вялікія страты, праціўнік кідаў і кідаў у атаку свежыя рэзервы на ўсім рубяжы абароны вёскі Зарэчка. У крытычны момант Давідзюк загадаў партызанам адысці на другую лінію абароны. Неўзабаве стральба і артылерыйская кананада пачалі заціхаць. Вораг не пайшоў далей за вёску. Але для Георгія Давідзюка гэты бой стаў апошнім. З прычыны ранення ён пачаў лічыцца «нестраявым», і яго спісалі з фронту.

Нельга сказаць, што Георгію Пятровічу прыемна ўспамінаць свае раненні. Лячыць іх было вельмі цяжка. У першыя гады вайны партызаны не мелі ўласных шпіталяў. Ды і ствараць іх не было сэнсу: нешматлікія партызанскія атрады вымушаны былі пастаянна ўцякаць у глыбіню лесу ад праследу немцаў. Параненыя перамяшчаліся разам з атрадам у павозках. Хоць яны знаходзіліся пад наглядам партызанскага ўрача, лячыць іх не было чым. Лепш было, калі параненых бралі да сябе сяляне. Прафесар памятае, як яго паламаныя ногі зімой 1943 г. цэлы месяц выходжвалі ў сялянскай хаце. Зусім іншая рэч, чым цярпець боль на холадзе. Зямлянкі, якія ў канцы вайны пачалі будаваць партызаны, калі немцы ўжо баяліся іх колькаснай перавагі, Георгій Пятровіч таксама лічыць за раскошу, бо асабіста яму часта прыходзілася разам з астатнімі байцамі класціся спаць на снег. І, што цікава, ён ніколі не хварэў.

Давідзюк успамінае з усмешкай сваю 50-кіламетровую разведку да ўкраінскага мястэчка Корыстань. Сам камандзір брыгады Герасімаў назваў яе цяжкім і незвычайным заданнем. Група партызан павінна была прайсці праз лінію фронту ўглыб тэрыторыі. Камандаванне не ведала, з якімі варожымі сіламі могуць сутыкнуцца пад час вандроўкі разведчыкі, ды і балоты на іх шляху былі топкімі. А выйшла наадварот, Георгію Давідзюку пашанцавала. Ён са сваёй групай так і не сустрэў немцаў. Балоты таксама не стварылі перашкод для выканання задання, бо былі пакрыты лёдам. Пасля вяртання разведка данесла, што ў напрамку Ровенскай вобласці ўсё спакойна.

Калі ў маі 1943 г. Георгія Давідзюка прымалі ў партыю, усе члены партбюро прагаласавалі за яго кандыдатуру аднагалосна. Іх характарыстыка была красамоўнай: «Гэта найлепшы ў атрадзе камандзір роты. Яго баявыя заслугі, яго аўтарытэт сярод партызан усім добра вядомыя».

**Ганна ЛАГУН**

# ЯК МАЛЕНЬКІ ДЗІМА ХАДЗІЎ У РАЗВЕДКУ

Малы партызан, якога можна пасылаць у разведку. Гэта якраз пра **Дзмітрыя УМРЭЙКУ,** доктара фізіка-матэматычных навук, заслужанага дзеяча навукі, якому напачатку вайны было 7 год. З яго могуць браць прыклад хлопчыкі, якія сёння гуляюць у касмічныя войны ці зрэдку ў партызан.



Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

Падзяліцца на атрады, выкапаць зямлянку, зрабіць засаду ў лесе, каб усё было, як тады, у далёкіх 1941–1944 гг. – гэта вымагае ад дзяцей і цяпер кемлівасці і смеласці. Дзмітрый Сцяпанавіч таксама выконваў заданні партызанскага камандзіра, але насамрэч, у гады Вялікай Айчыннай вайны, якая пакінула такі глыбокі след у душах беларусаў.

Улетку 1941 г. Дзмітрый Умрэйка таксама паехаў адпачываць, як і сучасныя дзеці, да бабулі і дзядулі ў вёску Лавы Капыльскага раёна. Яго дзядуля Аляксандр Мікалаевіч Пыліла тады працаваў леснікам, і таму маленькі Дзіма шмат часу бавіў у лесе, які з усіх бакоў абступаў іх маленькі драўляны домік. Калі пачнецца вайна, ён таксама шмат часу будзе праводзіць у лаўскім лесе, у якім партызаны выкапаюць вялікую колькасць зямлянак. Маленькаму Дзіму наканавана было стаць сувязным партызанскага атрада імя Будзённага 95-й брыгады імя Фрунзэ. Ён і сёння памятае той дзень, як у дзядулевай хаце, якая стаяла наводдаль ад вёскі, з'явіўся камандзір атрада Міхаіл Мікалаевіч Ізюмскі, былы таварыш бацькі Дзімы па народным камісарыяце асветы, ужо знаёмы з яго маці, якая да гэтага часу прыехала да сына з Мінска. Так іх хата стала месцам явак партызанскага злучэння.

У другі раз партызанскі сувязны з'явіўся ў іх доме пры поўнай канспірацыі, бо ў Лавы прыйшлі немцы. Малога Дзіму адправілі ў вёску, каб высветліць усю сітуацыю і настрой яе жыхароў. Важна было даведацца, ці няма здраднікаў сярод сваіх або тых, хто не супраць папрацаваць на акупантаў. Дзіму было даручана стварыць невялічкую групу такіх жа хлапчукоў, каб збіраць у лесе кінутую зброю і гарматы, якія маглі быць выкарыстаны партызанамі ў баях.

Маленькія хлопчыкі не раз маглі назіраць, як праз вёску адступаюць нашы ваенныя часткі. Пра тое, што набліжаюцца немцы, чутка разносілася вельмі хутка. Тады жыхары Лаваў збіралі неабходныя рэчы і ўцякалі ў лес. Вярнуўшыся, яны маглі застаць на месцы сваіх хат папялішчы.

Хата бабулі і дзядулі Дзімы ўцалела. За гады вайны ў ёй прайшло некалькі сустрэч савецкага ваеннага кіраўніцтва Мінскай вобласці на чале з Іванам Дзянісавічам Варвашэнем. Роля маленькага Дзімы заключалася ў тым, каб, знаходзячыся ў вёсцы, глядзець і слухаць, ці не прасачылася нейкім чынам інфармацыя пра нарады да іншых.

Дзмітрый Сцяпанавіч успамінае, як пасля бою ў старыцкім лесе змучаныя, стомленыя, параненыя партызаны, зайшоўшы ў іх домік, літаральна падалі на ложкі і падлогу. Аднак адпачыць ім так і не давялося. Не прамінула і паўгадзіны, як іх падняў на ногі і павёў у лес камандзір партызанскага злучэння. Гэта быў, як пазней высветлілася, будучы генерал-маёр Піліп Піліпавіч Капуста, а тады Фёдар Фёдаравіч Бажэнка.

Перадыслакаваўшыся са старыцкага ў лаўскі лес, партызанам за паўтара месяца ўдалося падлекаваць усіх параненых, у чым вялікая заслуга начальніка шпіталя Міхаіла Майсеевіча Герасіменкі, які і пасля вайны доўгі час узначальваў Уздзенскую раённую бальніцу. Дзмітрый Сцяпанавіч расказвае, што шпіталь заняў вялікую хату паблізу. І ён мог таксама ў нечым дапамагчы параненым.

Менавіта гэты шпіталь абаранялі героі падчас усім вядомага Лаўскага бою. У задачу 18 партызан на чале з камандзірам узвода Вікенціем Драздовічам, якія занялі пазіцыю на клецішчанскіх могілках, уваходзіла не прапусціць немцаў да вёскі Лавы, пакуль не будзе эвакуяваны шпіталь. Лапік могілак, які зарос дрэвамі ў чыстым полі, фактычна з'яўляўся мішэнню для артылерыі і мінамётаў праціўніка. Усе байцы загінулі, аднак вораг не прайшоў углыб зацішна.

Дзмітрый Умрэйка з маці ў гэты час сталі разам з партызанамі на ўскрайку лесу і чакалі немцаў. Аднак тыя пасля вялікіх страт на клецішчанскіх могілках перадумалі нападаць.

Пра Лаўскі бой расказвалі ў сваіх вершах Адам Русак, Анатоль Астрэйка. Заслужаны мастак СССР Міхаіл Савіцкі намаляваў карціну пад назвай «Лаўскі бой». Сёння імёны 18 байцоў увекавечаны на помніку, які ўстаноўлены на тых жа могілках, дзе яны змагаліся ў 1942 г. Цяпер ужо прафесар і заслужаны навуковец, Дзмітрый Умрэйка таксама наведваецца на гэта месца, каб аддаць даніну памяці тым, хто абараняў і яго жыццё.

Сям'я Умрэйкаў не скарысталася магчымасцю эвакуявацца на адным з авіяцыйных рэйсаў і да канца вайны выконвала функцыю сувязной.

Дзмітрый Сцяпанавіч памятае, як пасля вайны, ужо дома ў Мінску, іх з маці выклікалі ў органы ўлады і ўзнагародзілі: яго – медалём «Партызану вайны II ступені», а маці – медалём «Партызану вайны I ступені». Дзмітрый Умрэйка атрымаў і ордэн Айчыннай вайны II ступені.

Дзмітрый Сцяпанавіч успамінае, як пасля вайны адмянялі карткі, а цэны не ўзрасталі, а, надварот, кожны год памяншаліся. Як не было грошай, каб купіць тое, што хочацца. Аднак жыла надзея, што ўсё будзе наноў адбудавана, адноўлена і распачата, таму што яны з маці засталіся жывымі, вярнуўся бацька, і больш няма вайны. Сёння яму вельмі дзіўна, што людзі надаюць вельмі вялікае значэнне матэрыяльным каштоўнасцям і змагаюцца, каб адваяваць іх адзін у аднаго. Ён гаворыць, што раней былі іншыя ідэалы. Таму беларускі народ і змог перамагчы.

**Ганна ЛАГУН**

З ГІСТОРЫІ ПАДПОЛЛЯ

# «Подзвіг даўжынёю ў 1100 дзён і начэй у лёсе горада-героя Мінска»

***«Я ведаю, што будзе рабіць мой народ… У занятых ворагам раёнах створацца народныя атрады – конныя і пешыя, вока – за вока, зуб – за зуб адкажам мы фашыстам, не дамо ім ні адпачынку, ні тэрміну. Паляцяць у паветра масты, склады і абозы. Любяць у Беларусі прошаных гасцей і не любяць няпрошаных. Пакуль будзе жывы хоць адзін беларус, не будзе на беларускай зямлі супакою фашысцкім захопнікам».***

**Янка КУПАЛА**



*Георгій Фалевіч*



*Уладзімір Амельянюк*



*Марыя Осіпава*



*Марына Малаковіч*



*Яўген Клумаў*



*Яўген Зубковіч*

22 чэрвеня 1941 г. Нядзеля. Чатыры гадзіны раніцы. У мірную цішыню сёлаў і гарадоў урываюцца выбухі бомбаў і снарадаў. Так пачалася Вялікая Айчынная вайна.

23 чэрвеня ў Мінску гарэлі будынкі, заводы, фабрыкі, а ўжо праз дзень цэнтр горада ператварыўся ў суцэльныя руіны. Фашыстам быў патрэбны Мінск як шлях на Маскву, але менавіта тут яны сустрэлі адчайны супраціў байцоў Чырвонай Арміі: за тры дні баёў вораг страціў 300 танкаў і быў адкінуты на 14 км назад, але сілы былі няроўныя.

У суботу 28 чэрвеня 1941 г., на сёмы дзень вайны, немцы ўвайшлі ў Мінск, а раніцай 29 чэрвеня ў парку Чалюскінцаў былі знойдзены забітымі два нямецкія афіцэры. У іх не было ні зброі, ні дакументаў. З гэтага дня Мінск пачаў змагацца, і барацьба працягвалася 1100 дзён і начэй.

Па задуме фашыстаў, Мінск павінен быў стаць ваенна-адміністрацыйным і палітычным цэнтрам акупаваных заходніх абласцей СССР. У горадзе размясцілася больш за 100 ваенных устаноў і тыл арміі «Цэнтр», паліцыя, штаб па барацьбе з партызанамі, часткі СС, жандармерыя, генеральны камісарыят на чале з гаўляйтарам Вільгельмам Кубэ, кіраванне чыгункай, гандлёвае таварыства «Остланд», буйны гарнізон і каля 6000 салдат.

Але ўсё гэта так і не дапамагло фашыстам скарыць жыхароў горада, якія ў першыя ж месяцы акупацыі самастойна, па сваёй уласнай ініцыятыве, не ведаючы спачатку ні правілаў барацьбы, ні правілаў канспірацыі, супраціўляліся гэтым узброеным да зубоў нямецкім вайскоўцам, бо галоўнай зброяй гараджан была нянавісць да акупанта.

Мінскія камуністы ўжо ў ліпені 1941 г. сталі ствараць у горадзе першыя падпольныя групы і далучаць да барацьбы з ворагам тысячы людзей. Сярод іх былі студэнты і выкладчыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, якія, не паспеўшы эвакуявацца ў тыл ці пайсці на фронт, засталіся ў акупаваным горадзе і сталі выпрацоўваць свае далейшыя крокі па барацьбе з захопнікамі. Збіраліся часцей за ўсё ў Яўгена Ермалінскага. Пад кіраўніцтвам дасведчаных камуністаў раёна камсамольцы сталі аб'ядноўвацца ў групы для актыўнай падпольнай барацьбы з ненавіснымі акупантамі. Склалася камсамольска-маладзёвая група Я. Ермалінскага з цэнтрам на пладова-агароднінай базе № 1 (вул. К. Лібкнехта, 43), а другая група – вакол Г. Г. Фалевіча з цэнтрам у аптэцы № 1 (вул. Савецкая).

Перад вайной Георгій Фалевіч паспеў скончыць 4 курсы хімічнага факультэта БДУ. Ці думаў ён, што пры гітлераўцах стане загадчыкам аптэкі? Але падпольшчыкам патрэбна была надзейная явачная кватэра, патрэбныя былі медыкаменты, і студэнту-хіміку прыйшлося гэтым заняцца. Услед за Георгіем, якога сярод сваіх звалі «Жорж», у аптэку на Савецкай вуліцы побач з будынкам гестапа ўладкаваліся яго нявеста – Ніна Ярмоленка, студэнтка 2 курса хімічнага факультэта, Дзмітрый Макееў – студэнт 3 курса медыцынскага інстытута, прыняты вартаўніком. Прыйшоў і Алік Суша – студэнт геаграфічнага факультэта БДУ, з якім Г. Фалевіч быў добра знаёмы.

Сам выбар месца дзеяння групы меў вялікія магчымасці для падпольшчыкаў. У аптэцы № 1 заўсёды збіраўся народ па лекі, якіх было не так густа ў горадзе. Г. Фалевіч меў невялікі ізаляваны пакойчык, які стаў яму службовым кабінетам.

Усю восень і зіму 1941–1942 гг. кабінет загадчыка аптэкі служыў надзейным месцам хованкі для сувязных партызан, тут жа захоўваўся друкарскі шрыфт, пачкі бланкаў хлебных картак, якімі забяспечваліся падпольшчыкі і сем'і партызан. Нямала дэфіцытных медыкаментаў было пераправлена адгэтуль у партызанскія атрады.

26 мая 1942 г. у аптэцы была ўладкавана засада. Г. Г. Фалевіч, Н. А. Ярмоленка, Д. Макееў былі арыштаваны. Пасля допыту Ніну Ярмоленку адпусцілі за адсутнасцю доказаў. Г. Фалевіча ўсё лета падвяргалі страшным катаванням, спадзеючыся атрымаць ад яго звесткі пра ўдзельнікаў падполля, адрасы явак, прозвішчы сувязных. Адважны юнак трымаўся выключна мужна, узяў на сябе ўсю віну, каб выратаваць астатніх падпольшчыкаў. У верасні 1942 г. Г. Фалевіч быў расстраляны. Узнагароджаны Георгій ордэнам Айчыннай вайны ІІ ступені (пасмяротна).

Дзмітрый Макееў загінуў, а Алік Суша, пазбегнуўшы арышту, быў схоплены пазней і загінуў у СД у 1943 г.

Адным з пастаянных наведнікаў аптэкі №1 быў сябар Г. Фалевіча студэнт 4 курса Беларускага камуністычнага інстытута журналістыкі імя С. М. Кірава Уладзімір Амельянюк.

Ён быў членам новага гаркама партыі, адказным за выпуск падпольнай газеты «Звязда», выхад якой для немцаў быў як гром сярод яснага неба. Яны думалі, што падполле раздушана. І раптам, пасля масавых пакаранняў смерцю – камуністычная газета, ды яшчэ падпісаная гаркамам партыі. За раскрыццё падпольнай друкарні была абяцана ўзнагарода ў 75 тыс. марак.

А газету набіралі літаральна на вачах у немцаў – у Доме друку, дзе выпускаліся нямецкія газеты і часопісы. Набор выносілі па начах у малочных бітонах на кватэру Вора-



ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЗВЯЗДА

Орган Мінскага Гаркома КП(б)Б

№ 1 ЧЭРВЕНЬ 1942 г.

ТАВАРЫШЫ!

З сённяшняга дня Мінскі Гарком КП(б)Б аднаўляе выданне свайго органа—газеты «ЗВЯЗДА». Пішыце ў газету аб жыцці партызанскіх атрадаў, аб баявой іх дзейнасці, аб масобных партызанах, праявіўшых сябе ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі акупантамі.

РЭДКАЛЕГІЯ.

1942 ГОД ПАВІНЕН БЫЦЬ ГОДАМ ПОЎНАГА РАЗГРОМА ВОРАГА! СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!

ШЫРЭЙ ПАРТЫЗАНСКУЮ БАРАЦЬБУ!

Гістарычныя словы першамайскага загаду таварыша Сталіна аб тым, што 1942

БЛІЗКІ ЧАС АСЛАБАНЕННЯ

Нямецка-фашысцкая грабежніцкая армія церпіць паражэнне за паражэннем. Пад ударамі Чырвонай Арміі яна адкатваецца на захад. Адступаючы, фашысцкія орды знішчаюць і паляць нашы гарады і сёлы. Дарослых

ВЕСТКІ З ФРАНТОЎ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

(Ад Савецкага Інформбюро, ...)

На працягу ночы на 6-е чэрвеня

навых, дзе валікам адкатвалі спачатку адну паласу, потым іншую. І так 2000 асобнікаў. Тыраж газеты хутка распаўсюдзілі па ўсёй Беларусі. Яе з'яўленне выклікала прыліў новых сіл для барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, што выклікала разгубленасць і лютасць акупацыйных улад, якім у дапамогу з Берліна для пошуку друкарні былі прысланыя дасведчаныя контрразведчыкі.

Уладзіміра Амельянюка агенты СД высачылі на вуліцы. Але схапіць яго ім так і не ўдалося: ён загінуў у перастрэлцы з гітлераўцамі. Пасля яму было пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Імем героя названы вуліцы ў гарадах Дно і Мінск.

Так, выпуск падпольнай газеты з'явіўся сапраўдным подзвігам мінскіх падпольшчыкаў. Дарэчы, абяцаная ўзнагарода так і засталася незапатрабаванай.

Адну з першых патрыятычных груп у Мінску стварыла выпускніца, а ў далейшым і выкладчык юрыдычнага інстытута Марыя Барысаўна Осіпава. У гэту групу ўваходзілі студэнты Р. Бромберг, М. Сталоў, выкладчыкі М. Ф. Малаковіч (МЮІ), Н. Н. Крачатовіч (БПІ), І. Р. Некрашэвіч (БДУ) і іншыя.

Сярод шматлікіх патрыятычных спраў М. Б. Осіпавай («Чорнай») і яе групы – распаўсюд зводак Саўінфармбюро і газеты «Звязда», выратаванне савецкіх ваеннапалонных і адпраўка іх у партызанскія атрады, дастаўка партызанам зброі, боепрыпасаў і медыкаментаў, якія яна сама перавозіла праз нямецкія пасты. Была і яшчэ адна, самая галоўная, справа.

А менавіта ў 1943 г. у горадзе была праведзена падрыхтоўка і ажыццяўленне аперацыі па знішчэнні ката беларускага народа Вільгельма фон Кубэ. М. Б. Осіпава была непасрэдным выканаўцам акцыі. Яна, рызыкуючы жыццём, пранесла міну з хімічным дэтанатарам праз гітлераўскія пасты і перадала яе А. Р. Мазанік, якая працавала прыслугай у доме В. Кубэ. Міна была закладзена пад матрац ложка гаўляйтара, і 22 верасня 1943 г. В. Кубэ быў забіты.

За гэты подзвіг у 1943 г. М. Б. Осіпавай (разам з А. Р. Мазанік і Н. В. Траян) было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

З Мінскім падполлем быў цесна звязаны і прафесар Ілья Рыгоравіч Некрашэвіч. Ён сам распавядаў: «У кастрычніку 1943 г. пасля правядзення М. Б. Осіпавай аперацыі па знішчэнні гаўляйтара Кубэ я ў якасці байца паступіў у распараджэнне 2-й Мінскай чырвонапартызанскай брыгады». У партызанскім атрадзе разам з жонкай, урачом па спецыяльнасці, Ілья Рыгоравіч знаходзіўся па ліпень 1944 г. і прымаў непасрэдны ўдзел ва ўсіх баявых аперацыях у якасці шараговага байца. Пасля вызвалення Беларусі ад акупантаў ён вярнуўся ў БДУ і працаваў на кафедры агульнай фізікі.

Яшчэ адным выкладчыкам БДУ, які падчас акупацыі арганізаваў групу з ліку былых выкладчыкаў і студэнтаў-юрыстаў, была Марына Фядосаўна Малаковіч. Увосень 1941 г. М. Ф. Малаковіч узначаліла ўтвораную з разрозненых падпольных груп (участка Мінскага аддзялення чыгункі) адзіную Каладзішчанскую падпольную арганізацыю. Арганізацыя перадавала партызанам і мінскім падпольшчыкам каштоўныя разведданыя, зброю, боепрыпасы, а таксама праводзіла дыверсіі на варожых камунікацыях. Уласнымі сіламі М. Ф. Малаковіч здабыла схемы дыслакацыі фашысцкіх аэрадромаў, баз, якія павінны былі забяспечваць аэрадромы палівам, а таксама звесткі пра сістэму радыёсувязі ў авіяцыйных частках нямецкай арміі.

У жніўні 1943 г. пры падрыхтоўцы чарговай баявой аперацыі таленавітая педагог-выхавальніца і ўмелая арганізатар-падпольшчыца была схоплена і закатавана гітлераўцамі. М. Б. Малаковіч пасмяротна ўзнагароджана ордэнам Айчыннай вайны ІІ ступені. Цяпер яе імя носіць вуліца мястэчка Калодзішчы.

З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны звязаны лёс яшчэ аднаго выкладчыка, прафесара Беларускага медыцынскага інстытута, Яўгена Уладзіміравіча Клумава, сям'я якога не паспела эвакуявацца. Прафесар працягнуў сваю працу ў 3 клінічнай бальніцы. Як патрыёт ён звязаўся з падполлем і стаў дапамагаць падпольшчыкам і партызанам. Я. У. Клумаў пад псеўданімам «Самарын» і іншыя дактары бальніцы выдавалі «ліпавыя» даведкі, якія ратавалі людзей ад згону ў Германію, перадавалі медыкаменты, дапамагалі абсталёўваць два палявыя шпіталі, аказвалі медыцынскую дапамогу партызанам і насельніцтву.

У кастрычніку 1943 г. Я. У. Клумаў і яго жонка, выкладчык-фізік мединстытута Г. М. Анісімава, былі арыштаваны. Гітлераўцы прапанавалі прафесару працаваць на рэйх, але ён адмовіўся. Гітлераўцы адправілі прафесара і яго жонку ў лагер смерці Трасцянец, дзе ён пераносіў нечалавечыя пакуты. У 1944 г. Клумаў загінуў у газавай камеры.

За мужнасць і гераізм, праяўленыя ў гады Вялікай Айчыннай вайны, прафесару Я. У. Клумаву пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Таксама яго імем названа бальніца, дзе ён працаваў, і адна з вуліц Мінска.

Усяго некалькі дзён не дажылі да вызвалення Мінска ўдзельнікі падпольнай групы дацэнта біялагічнага факультэта БДУ Яўгена Міхайлавіча Зубковіча, у якую таксама ўваходзілі асістэнт А. В. Вязовіч і аспірантка Зінаіда Завістовіч.

Калі пад свой шпіталь фашысты адвялі будынак біялагічнага факультэта, яны пачалі выкідваць адтуль экспанаты заалагічнага музея. Удзельнікі падпольнай групы, рызыкуючы ўласным жыццём, перанеслі экспанаты на Віцебскую вуліцу і схавалі іх. Потым яны ўсталявалі сувязь з гарадскім падпольным антыфашысцкім цэнтрам. Літаральна за некалькі дзён да вызвалення Мінска, у канцы чэрвеня 1944 г., фашысты не толькі арыштавалі, але і расстралялі іх. Я. М. Зубковіч загінуў у канцлагеры «Трасцянец» 29 чэрвеня; звесткі пра дату і месца пакарання смерцю А. В. Вязовіча і З. І. Завістовіч пакуль, на жаль, не вядомыя.

Вялікая Айчынная вайна – самая кровапралітная і цяжкая, самая значная па сваіх выніках і наступствах. Пачуццё патрыятызму беларускага народа ў гады вайны дасягнула найвышэйшага апагею. Гэта была не толькі ваенная, але і духоўная перамога дабра над злом, жыцця над смерцю, волі над рабствам.

У гады Вялікай Айчыннай вайны фашысты знішчылі велізарную колькасць людзей. Хоць кожны з іх уяўляў цэлы незвычайны свет. Дзеці не паспелі пабудаваць свае дамы, напісаць свае кнігі, праспяваць свае песні, нарадзіць дзяцей. Ім было тады гэтулькі ж гадоў, колькі зараз і нашым навучэнцам, ім таксама вельмі хацелася жыць, але Героі абралі шлях барацьбы і ўвайшлі ў гісторыю краіны, выканаўшы святы абавязак перад Радзімай, якой яны былі самаахвярна адданыя.

За гэта ім вечная памяць і нізкі паклон!

Мы ў іх у неаплатным даўгу!

**Дар'я ПРЫГОДЗІЧ,**
**супрацоўнік музея гісторыі БДУ**



*Ветэраны на святкаванні Дня Перамогі ў БДУ. 7 мая 2013 г.*

# БДУ – універсітэт Перамогі,

## або Як універсітэт адзначае Дзень Перамогі ў сацыяльных сетках

Ужо 70 гадоў прайшло з часу вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Ужо 70 гадоў мы бачым мір, усмешкі дзяцей і радасці новых адкрыццяў. Ужо 70 гадоў мы не ведаем страшнага слова «вайна».

Вялікая Айчынная вайна пакінула глыбокі след у гісторыі Беларусі і душах простых людзей. Гэта незагойная рана ў сэрцах цэлага пакалення.

Подзвіг герояў Вялікай Айчыннай вайны неўміручы. Мы, спадчыннікі той Вялікай Перамогі, заўсёды будзем памятаць самаадданых людзей, якія сапраўды любілі сваю Радзіму, памятаць тых, чыімі рукамі падняты сцяг Перамогі, на чыіх плячах ляжала аднаўленне разбуранай зямлі. Час ідзе, усё змяняецца, але нязменным застаецца адно – памяць пра Вялікую Перамогу.

Як ужо было сказана, час ідзе, з'яўляюцца новыя тэхналогіі, аднымі з якіх з'яўляюцца інтэрнэт і сацыяльныя сеткі. Менавіта на прасторах «сусветнага павуціння» БДУ вырашыў правесці серыю акцый у гонар Дня Перамогі і 70-годдзя вызвалення Беларусі. Вось пра іх і распавядзём.

Першая маштабная акцыя, носіць гучную назву **«Універсітэт Перамогі».** На афіцыйных старонках БДУ ў Facebook, Twitter і «УКантакце» размяшчаецца інфармацыя пра супрацоўнікаў і студэнтаў нашага ўніверсітэта, якія геранчна прайшлі вайну. Гэта публікацыі пра такіх людзей, як Павел Антонавіч Гарошак, Дзмітрый Пятровіч Жмуроўскі, Навум Ільіч Жолудзеў, і іншых герояў БДУ.




Другім значным мерапрыемствам у сацыяльных сетках з'яўляецца **інтэлектуальны конкурс «Парад Перамогі».** Акцыя доўжылася з 7 красавіка па 5 мая «УКантакце». Удзельнікі спецыяльна створанай групы адказвалі на падступныя пытанні пра вайну і Вялікую Перамогу на працягу 4 тыдняў. У першы тыдзень удзельнікаў чакалі заданні пра месцы баявой славы, у другі тыдзень іх правяралі на веданне гістарычна важных імёнаў, трэці тыдзень яны адказвалі пра зброю Перамогі, а чацвёрты тыдзень прынёс удзельнікам пытанні пра творчасць у гады вайны.

Дагэтуль якраз ужо вызначыліся лаўрэаты:

Пераможца першага этапу конкурсу: студэнт 3 курса гістарычнага факультэта, кіраўнік палітычнага кірунку БРСМ БДУ *Антон Купчын;*

Пераможца другога этапу конкурсу: студэнт 5 курса юрыдычнага факультэта, сакратар ПА ГА «БРСМ» з правамі РК БДУ *Яўген Харук;*

Пераможца трэцяга этапу: студэнт 3 курса факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій, сакратар БРСМ ФРКТ *Максім Сурмач.*

Пераможца чацвёртага этапу стаў вядомы пасля падпісання нумара газеты ў друк. З канчатковымі вынікамі можна пазнаёміцца ў групе конкурсу http://vk.com/paradpobed.

Наступным маштабным мерапрыемствам, на якім варта спыніцца падрабязней, з'яўляецца **фотапраект БДУ да Дня Перамогі «Мінулае–сучаснасць».** Ідэя фотапраекта простая: трэба знайсці фота ваенных гадоў і зрабіць здымак з таго ж ракурсу, што і 70 гадоў назад, сумясціць іх, апрацаваць і стаць аўтарам выставы. Усяго ўдзельнікі падалі 9 такіх фотапрац, якія неўзабаве стануць экспанатамі незвычайнай выставы! Менавіта яны прадстаўлены ў дадзеным матэрыяле.



*Аляксандр Шэлегаў*



*Антон Шчэннікаў*



*Сяргей Ларанкоў*



*Арцём Сёмін*



*Сяргей Ларанкоў*



*Антон Шчэннікаў*

Фатаграфіямі дзядуляў і бабуль-ветэранаў, шчаслівымі ўсмешкамі і радаснымі момантамі Дня Перамогі напаўняецца і Instagram БДУ! Да 11 мая ўсе ахвотныя могуць паўдзельнічаць у **конкурсе «За ДЗЕНЬ ПЕРАМОГІ Ў МАІ скажы дзякуй у ІНСТАГРАМЕ».** Для гэтага трэба ўсяго толькі размясціць фатаграфіі з хэштэгамі #bsu_official і #ourvictory. Яны аўтаматычна пераносяцца ў Інстаграм БДУ і на стол экспертнай камісіі. 13 мая будуць вызначаныя два пераможцы: па глядацкіх «лайках» і меркаванні журы.

У групах БДУ асвятляюцца буйныя акцыі факультэтаў і студэнцкіх грамадскіх арганізацый. Напрыклад, гістарычны факультэт БДУ праводзіць *міжнародны конкурс навуковых прац «Агульны шлях да Вялікай Перамогі: да 70-годдзя вызвалення Беларусі»*, студэнцкі гарадок арганізуе *конкурс вершаў «Памяць сэрца...»,* а прафкам студэнтаў БДУ – *акцыю «Мы памятаем...».*

Усе гэтыя і многія іншыя акцыі і мерапрыемствы ў гонар Перамогі праводзяцца і асвятляюцца ў сацыяльных сетках БДУ. І гэта толькі пачатак. Яшчэ шмат акцый і мерапрыемстваў вас чакае на нашых старонках:

*«УКантакце»: http://vk.com/bsu_by*

*Facebook: https://www.facebook.com/bsuby*

*Twitter: https://twitter.com/BSU_official*

*Instagram: http://instagram.com/instabsuby*

*YouTube: http://www.youtube.com/user/YouthBSU*

Мы памятаем подзвіг Вялікіх людзей і ганарымся Вялікай Перамогай!

**Анастасія РАМАНАВА,**
**куратар груп БДУ ў сацыяльных сетках**

УНІВЕРСІТЭТ
**Выдаецца з 1929 года**

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

7 мая 2014 года
Падпісана да друку 5.05.2014 г.
Зак. ___. Тыраж 1500 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»
ЛП № 02330/0494178 ад 03.04.2009.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

**Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ**
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
***e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by***